Краеведческий
Солигорска

# НАСУСТРАЧ ПЛЕНУМУ ЦК КПСС



З агеньком працуюць шахтапраходчыкі і будаўнікі наземных збудаванняў другога Салігорскага калійнага камбіната. Вядзецца праходка трох шахт. Праходчыкам першага ствала неабходна паглыбіцца на 541 метр, а трэцяга — на 645-метровую глыбіню. Урадавым заданнем прадугледжана закончыць праходку і мацаванне першага і трэцяга ствалоў да 1 студзеня 1964 года. Праходчыкі абавязаліся завяршыць гэтыя работы раней — да 10 снежня. Калектывы абедзвюх шахт цвёрда трымаюць сваё слова. Ім засталося прайсці да праектнай адзнакі па некалькі дзесяткаў метраў.

Лепшых паказчыкаў у рабоце дабілася скразная кругласутачная праходчая брыгада першага ствала, узначальваемая Анатолем Селіванавым. Вопытныя шахцёры вядуць праходку ствала з апярэджаннем графіка.

НА ЗДЫМКУ: А. Селіванаў (справа) і горны майстар А. Алейнікаў.

**Фота П. Наватарава.**
Фотахроніка БЕЛТА.